Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

6 ЧЭРВЕНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА № 22 (15526)

# Шматгранныя таленты шматдзетных сем'яў

**Беларускі дзіцячы фонд уручыў ганаровыя граматы імя Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі. Іх удастоіліся тры шматдзетныя сям'і: Пятрасікаў — з Гродзенскай вобласці, Цапікаў — з Магілёўскай і Рашукоў — з Гомельскай.**

Пятрасікі — Тамара Анатольеўна і Лявон Браніслававіч выхоўваюць шасцёра дзяцей. Гаспадыня працуе ў Ваўкавыскай дапаможнай школе-інтэрнаце настаўніцай спеваў, гаспадар — плітачнікам ва УП «Эканом-сэрвіс». Сям'я паважае самыя розныя музычныя інструменты — фартэпіяна, гітару, баян, цымбалы, а Лявон Браніслававіч і старэйшы сын Павел любяць яшчэ і рыбалку. У сям'і Цапікаў з г.п. Бялынічы — дзевяць дзяцей. Бацька, Аляксандр Мікалаевіч, — сталяр раённага аддзела адукацыі. Маці, Вольга Уладзіміраўна, працуе гардэробшчыцай у спартыўнай школе, захапляецца рукадзеллем і развядзеннем кветак. Дзеці сур'ёзна займаюцца спортам. Рашукі — Алена Ільінічна, Валерый Іванавіч і пяцёра дзяцей пражываюць у Рагачоўскім раёне. Галава сямейства — механізатар СВК «Чырвоная Армія», а маці, настаўнік гісторыі па адукацыі, зараз знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску. Усе цікавяцца музыкай, спевамі і маляваннем, Алена Ільінічна сёлета была ўзнагароджана Ордэнам Маці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Першы крок у навуку

**У сценах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне прэміямі і дыпломамі Міністэрства адукацыі лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў за 2007 год.**

Усяго на конкурс была прадстаўлена 3321 работа. Найбольшую актыўнасць праявілі студэнты БДМУ, якія прадставілі на конкурс 280 сваіх работ, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (252 работы), Мінскага інстытута кіравання (248 работ), Белдзяржуніверсітэта (182 работы) і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (174 работы).

З удзелам студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў конкурсе, было апублікавана 3912 навуковых артыкулаў і 2974 тэзісы. Званне лаўрэата Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ было прысвоена 60 аўтарам, 14 з іх з'яўляюцца аспірантамі і магістрантамі. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт падрыхтаваў 8 лаўрэатаў конкурсу, БДУ — 6, БДМУ — 5 лаўрэатаў і па 3 лаўрэаты — БНТУ, Мінскі лінгвістычны і Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Ствараючы свята

**Ствараць дабро заўсёды прыемна, ствараць свята, асабліва калі гэта свята для дзяцей, — удвая прыемней.**

Беларускі індустрыяльны банк сумесна з Тэатрам юнага гледача арганізаваў дабрачынную акцыю, прымеркаваную да Міжнароднага дня абароны дзяцей: у ТЮГу адбыўся прэм' ерны паказ спектакля па п'есе вядомага беларускага драматурга Сяргея Кавалёва «Вандраванне ў княства сноў», на які былі запрошаны выхаванцы дзіцячых дамоў і інтэрнатаў, дзеці з малазабяспечаных сем'яў. Усяго 455 хлопчыкаў і дзяўчат пабывала ў гэты дзень у ТЮГу.

Перад спектаклем юныя гледачы змаглі паразмаўляць з вясёлымі клоунамі, добрымі казачнымі персанажамі, узялі ўдзел у бяспройгрышнай латарэі, разам з артыстамі выконвалі любімыя песні.

Ад імя Беларускага індустрыяльнага банка прысутных павітала маркетолаг Алена Наркевіч. Да віншаванняў далучыліся таксама галоўны рэжысёр ТЮГа Наталля Башава і беларуская дзіцячая пісьменніца Алена Масла.

Сам спектакль дзецям вельмі спадабаўся. Артыстаў, занятых у ім, не хацелі адпускаць са сцэны. Маляўнічыя касцюмы, яркія персанажы, алегарычныя вобразы герояў-лялек, з вуснаў якіх гучалі простыя, па-дзіцячы наіўныя, але ў той жа час мудрыя ісціны, пакінулі незабыўнае ўражанне ў маленькіх сэрцах.

Як сказаў старшыня праўлення Беларускага індустрыяльнага банка Андрэй Кірэеў, «Міжнародны дзень абароны дзяцей нагадвае нам, дарослым, што дзеці не проста кветкі жыцця, яны — наша рэальная будучыня, і мы павінны дарыць ім радасць і цеплыню».

**Алена АФАНАСЬЕВА.**

# ПЕРШЫЯ ГРОШЫ Ў «ШКОЛЬНЫМ» ФАРМАЦЕ

**Як правесці лета, кожны выбірае сам, тым больш, што варыянтаў тут шмат. Адны ўжо вырашылі выкарыстаць вольны час для таго, каб «падцягнуць» англійскую мову, другія запланавалі вандроўку, трэція — адпачынак у бабулі ў вёсцы, а чацвёртыя... зусім не супраць зарабіць ніколі не лішнія «кішэнныя грошы». Да слова, чакаецца, што сёлета падчас канікулаў у сталіцы пры дапамозе службы занятасці змогуць уладкавацца больш за 5 тысяч школьнікаў, студэнтаў і навучэнцаў. Дзе, кім і на якіх умовах? Зрэшты, «пашукаць» адказы на гэтыя пытанні мы вырашылі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.**

Фота БЕЛТА.



## ДАРОСЛЫЯ ПРАВЫ, ДАРОСЛЫЯ ЎМОВЫ

Калі пачынаецца размова пра летнія заробкі, то пажаданне нумар адзін — знайсці «сапраўдную» работу на якім-небудзь прадпрыемстве ці ў арганізацыі. Такія магчымасці сёлета будуць, скажам, традыцыйнымі варыянтамі з'яўляюцца ўладкаванне на будоўлі, на дарожныя работы, у пункты грамадскага харчавання ці на работы па азеляненні горада. Разам з тым падобныя прапановы зноў акажуцца ў меншасці. Тады як галоўным напрамкам стане часовая занятасць у сваіх жа школах, вучылішчах, універсітэтах, цэнтрах дзіцячай творчасці, вучэбна-вытворчых камбінатах, а асноўнымі відамі дзейнасці — добраўпарадкаванне тэрыторыі, дробныя рамонты, выраб мяккіх цацак ці сувеніраў.

— Скептычныя адносіны многіх да ўладкавання ў навучальных установах зразумелыя, у рэшце рэшт, заўсёды хочацца чагосьці новага, а тую ж школу падлетак наведвае ўжо не адзін год, — кажа галоўны спецыяліст аддзела арганізацыі работы па садзейнічанні занятасці Людміла Атрашкова. — Разам з тым варта заўважыць: сёння ўжо нікому не патрэбныя работнікі, якія будуць проста «перакладваць паперы». З улікам адсутнасці у моладзі прафесійнай падрыхтоўкі, заявак ад прадпрыемстваў і арганізацый няшмат і асабліва — заявак на няпоўнагадовых. Таму адмаўляцца ад прапаноў работы па месцы навучання не варта, тым больш, што тут усё акажацца так, як і ў дарослых — падпішуць працоўны дагавор, афармяць цалкам сапраўдную працоўную кніжку, стануць рабіць адлічэнні ўзносаў сацыяльнага страхавання і, у рэшце рэшт, пачнуць плаціць цалкам рэальную зарплату.

Дзеля справядлівасці, «дарослымі» акажуцца не толькі правы, але і абавязкі. Любы нявыхад на работу без уважлівых прычын тут будзе лічыцца прагулам. А вынікам стане звальненне.

## ЗАРОБКІ ВЫЗНАЧАЕ ПАДРЫХТОЎКА

Як паказваюць апытанні, абсалютная большасць моладзі і падлеткаў у якасці пажаданых заробкаў падчас летніх канікулаў называе суму ў «400 тысяч рублёў і вышэй». Аднак на справе так бывае не заўсёды. На заробак у 500—800 тысяч могуць разлічваць пераважна хлопцы, якія ўладкуюцца дапаможнымі рабочымі ў будаўнічыя ці дарожныя арганізацыі. Найбольш верагодны ўзровень аплаты ў іншых месцах складзе 300—400 тысяч, а пры працаўладкаванні ў навучальнай установе трэба настройвацца на «мінімалку» — крыху больш чым на 200 тысяч рублёў.

Як заўважае Людміла Атрашкова, у дадзеным выпадку ўсё тлумачыцца проста. Моладзь і падлеткі яшчэ не маюць спецыяльнасцяў. Таму звычайна яны прымаюцца рабочымі першага разраду, зарплата якіх, як вядома, невысокая.

## 13 ГАДОЎ — ЯШЧЭ РАНА

Працаўладкаванне падлеткаў мае свае нюансы. Варта нагадаць іх яшчэ раз. Скажам, школьнікам, студэнтам ці навучэнцам абавязкова спатрэбіцца медыцынская даведка, а маладым людзям ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — яшчэ і пісьмовы дазвол бацькоў.

Другое правіла — скарочаны працоўны час. Для падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў ён не павінен перавышаць 23, а для моладзі ва ўзросце 16—18 гадоў — 35 гадзін у тыдзень. Інакш кажучы, работа не можа перавышаць 4 гадзіны 36 хвілін ці 7 гадзін у дзень адпаведна.

Яшчэ адно абмежаванне датычыцца працягласці работы. На часовае месца дазваляецца прыняць на тэрмін не больш за 2 месяцы. Праўда, потым пасля 7-дзённага перапынку можна спрабаваць уладкавацца зноў.

А плюс да ўсяго ёсць норма: падлеткі і моладзь можа прымацца толькі на лёгкія работы. Прычым у дадзеным выпадку асаблівая ўвага звяртаецца на нормы па пераносе цяжкасцяў, патрабаванні да вышыні, забарону «кантакту» з лакамі і фарбамі.

— Часта з просьбай дапамагчы знайсці часовы заробак звяртаюцца 13-гадовыя падлеткі — мы ім адмаўляем, — зазначае Людміла Атрашкова. — Бо магчымасць працаўладкавання толькі з 14 гадоў з'явілася ў заканадаўстве не выпадкова, у больш раннім узросце ёсць вялікая рызыка нашкодзіць здароўю маладога чалавека. А гэта не кампенсуюць ніякія грошы.

## ЛЕТА НЕ СКОНЧЫЦЦА Ў ЧЭРВЕНІ

Як і раней, пры працаўладкаванні перавага будзе аддавацца сіротам, моладзі з сем'яў беспрацоўных, няпоўных, шматдзетных і няўдалых сем'яў, а таксама моладзі, якая знаходзіцца на ўліку ў інспекцыях па справах няпоўнагадовых. Астатнім прыйдзецца складаней, прынамсі, праблема «дэфіцыту» часовых месцаў была актуальнай усе папярэднія гады.

— Нягледзячы на гэта, звярнуцца з просьбай аб уладкаванні мае права абсалютна любы малады чалавек, і мы паспрабуем дапамагчы кожнаму, — адзначае Людміла Атрашкова. — Але чамусьці атрымліваецца, што ажыятаж з вакансіямі ўзнікае толькі ў чэрвені. А вось у ліпені і тым больш у жніўні малюнак ужо адваротны: работа ёсць, ахвотнікаў — няма.

Між тым, шляхоў пошуку работы на канікулах некалькі. Так, у школьнікаў ва ўзросце 14—17 гадоў ёсць магчымасць звярнуцца да свайго сацыяльнага педагога, ва ўстанову пазашкольнай работы, вучэбна-вытворчы камбінат, непасрэдна службу занятасці, а ў навучэнцаў і студэнтаў ва ўзросце больш за 18 гадоў — звярнуцца ў штаб працоўных спраў па месцы вучобы, аддзел па справах моладзі адміністрацыі свайго раёна, БРСМ, «Маладзёжную сацыяльную службу», «Лігу добраахвотнай працы моладзі», у тую ж службу занятасці насельніцтва. У рэшце рэшт, праблему можна паспрабаваць вырашыць самастойна — пацікавіцца вакансіямі ў бацькоў ці на сайце гарвыканкама:

www.minsk.gov.by.

**Сяргей ГРЫБ.**

## ПЕРШЫ КОНКУРС ПА ЧЭРЛІДЗІНГУ

Упершыню ў Мінску пройдзе конкурс па чэрлідзінгу. Мінскі гарадскі камітэт БРСМ запланаваў яго на верасень.

Чэрлідзінг — групы падтрымкі спартыўных каманд — прыдумалі паклоннікі амерыканскага футбола, якія крычалі ў падтрымку сваёй любімай каманды, тупалі нагамі, пляскалі ў далоні. Гэты від спорту спалучае ў сабе акрабатыку, гімнастыку, танцавальныя элементы і абавязкова артыстычнае майстэрства. У Мінску ўжо ёсць больш за 50 каманд па чэрлідзінгу, групы падтрымкі — амаль у кожнай ВНУ і ў некаторых школах.

**Вольга ШАЎЧУК, «Мінск—Навіны».**




Асоба

# БЕЛАРУСЬ. АРМІЯ. ДЗЯЎЧЫНА



**Жанчына ў ваеннай форме. З'ява для нас да гэтага часу не вельмі звыклая. Позірк абавязкова выхапіць з натоўпу постаць з бездакорнай выправай у строгім шэра-зялёным касцюме. Мала хто ведае, чаго каштуе жанчыне штодня даказваць сваё права на нашэнне гэтай формы. І амаль ніхто не ведае, чым жыве і дыхае яна, якая яна — жанчына з пагонамі?**

У жніўні 2002 года на факультэт сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь былі залічаны сямёра незвычайных курсантаў. Сярод іншых яны вылучаліся тым, што мелі доўгія валасы, пышныя вейкі, насілі спадніцы... адным словам, былі дзяўчатамі. Незвычайным жа быў той факт, што яны былі першымі дзяўчатамі-курсантамі ў сценах вышэйшай ваеннай навучальнай установы Беларусі. Ім давялося прайсці пекла жорсткай уступнай кампаніі, пекла чакала іх і пасля... У гэтым першым жаночым наборы, адной з «першых ластавак» была і Алена Жукоўская.

Пасля знаёмства з гэтай дзяўчынай упэўніваешся ў праўдзівасці выслоўя: «Чым чалавек разумнейшы, тым ён прасцейшы ў зносінах». Адкрытая, гаваркая, вясёлая. Праз паўгадзіны размовы забываеш, у якой структуры працуе Алена, а яшчэ праз паўгадзіны здаецца, што ведаеш яе не першы год. У той жа час гэта чалавек мэтанакіраваны, упэўнены ў сваіх сілах, чалавек, які ведае, чаго хоча ад жыцця. Проста жыццё дало Алене магчымасць быць першай. І яна гэтым скарысталася.

## ВЫТОКІ

Машынкі ды пісталецікі, гульні ў «вайнушку» — дзяцінства сярод трох братоў прайшло для маленькай Аленкі цікава і сапраўды па-баявому. І нягледзячы на тое, што сёння два старэйшыя браты — Дзіма і Коля — ужо не адзін год служаць у ваенных структурах, дзяўчына адмаўляе іх уплыў на свой прафесійны выбар. Хутчэй, сам лёс распарадзіўся менавіта так...

У пятым класе лепшая вучаніца Чыжахскай вясковай школы Лена Жукоўская сутыкнулася з першымі ў сваім жыцці цяжкасцямі — ёй давялося перайсці ў школу раённую, што за трыццаць кіламетраў ад дома. Новае жыццё, новы, ужо на той момант зладжаны, калектыў, больш высокі ўзровень навучання. «Так, першы час адчувала сябе разгублена, як не ў сваёй талерцы, — прызнаецца яна. — Дый гэты вечны падзел на «гарадскія-вясковыя»... «Аднак цікаўная і рухавая з дзяцінства, дзяўчынка хутка дагнала і нават перагнала многіх сваіх гарадскіх аднагодкаў. Дадатковыя заняткі ў Цэнтры развіцця адораных дзяцей і моладзі, заняткі ў гуртку танцаў, акрабатыка... Хапала Алене часу і на тэатральную студыю.

Разумную і таленавітую школьніцу не маглі не заўважыць. Актыўная алімпіядніца пакідала добрыя ўспаміны аб сабе на абласных турах па фізіцы. Аднойчы настаўніца фізікі прапанавала дзяўчыне, якая на той момант вучылася ў класе з фізіка-матэматычным ухілам, паспрабаваць зрабіць кантрольную паралельнага класа, класа з ваенным ухілам.

— Сёння я разумею, што мая настаўніца на той момант ужо ведала пра жаночы набор, які планаваўся ў Ваенную акадэмію, і жадала мне найлепшага лёсу. Кантрольныя даваліся лёгка, упэўненасць у правільнасці выбару расла хутка. Мне ніхто ніколі не навязваў — кім быць. І за гэта я сваім бацькам удзячная. Я лічу, што трэба проста прыглядвацца, да чаго схільнае дзіця, і накіроўваць яго ў правільны бок.

Бацька выбарам дачкі ганарыўся, маці больш хвалявалася за яе і толькі бабуля была незадаволеная. Маўляў, нашто ў сям'і ажно тры вайскоўцы, тым больш дзяўчо. Аднак прайшло зусім няшмат часу і «дзяўчом» ганарылася ўся сям'я.

## БЫЦЬ ЛЕПШАЙ

Здавалася б, чаго хвалявацца — залаты медаль за курс сярэдняй школы, значны багаж ведаў і выдатная фізічная форма. Але... Конкурс — больш за 10 чалавек на месца. Для медалістаў — асобны іспыт: гутарка з выкладчыкамі. Пяць найскладанейшых пытанняў па трох прадметах. Адказ тут жа, без права роздуму.

У ліпені Алена была залічана ў лік курсантаў Ваеннай акадэміі Беларусі. А хтосьці сумняваўся?..

## ПЕКЛА

А ў жніўні іх чакаў пляц. Замест абцасаў — цяжкія берцы. Замест спаднічак — камуфляж. Курс маладога байца — гэта праграма пачатковай ваеннай падрыхтоўкі, уводны курс армейскага жыцця. Забыць, што ты — танклявая дзяўчынка-кветачка, якая прагне цяпла і пяшчоты... Два месяцы ў кампаніі з аўтаматам, плашч-намётам, рэчмяшком і процівагазам. Два месяцы вывучэння статутаў, заняткаў па страявой і агнявой падрыхтоўцы. У той час, калі былыя аднакласніцы спалі на сваіх першых лекцыях, Алена дзесьці пад Мінскам спасцігала майстэрства капання акопаў.

## «ДЗЕНЬ СУРКА»

З чаго пачынаецца армія? Правільна, з дысцыпліны. Пад'ём — у 6.30. У 6.40 — зарадка з абавязковай прабежкай у любое надвор'е. Далей — заняткі, абед, час для самападрыхтоўкі, курсы. Дзень распісаны па хвілінах. Жыццё па рэжыме. Па камандзе.

— Памятаю, як я ўпершыню «зламалася». Гэта было на другім курсе, у лютым. Падумалася: «І што, ВОСЬ ТАК яшчэ два з паловай гады?!» Добра, што гэта хутка прайшло, — дзеліцца Лена. — А вось адна з маіх сябровак не вытрымала — забрала дакументы пасля першага курса. Да «фінішу» дайшлі шасцёра. Мяне ж гэтыя няпростыя пяць гадоў шмат чаму навучылі. Навучылі не адмаўляцца ад пастаўленых мэтаў, не пасаваць у складанай сітуацыі, не спыняцца на дасягнутым, увесь час удасканальвацца. Яшчэ акадэмія вучыць жыць у калектыве. Ты ўвесь час у калектыве. Трэба ўмець будаваць зносіны з самымі рознымі па характарах і светапоглядах людзьмі. Ты нібы псіхолаг-дылетант. Усё гэта дапамагло мне ў жыцці.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «Ч.З.»)***

# Таленты, на сцэну

У Віцебску прайшоў фінал Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу мастацкай творчасці студэнтаў ВНУ «АРТ-вакацыі», які завяршыўся гала-канцэртам у Віцебскім летнім амфітэатры.

У фінале «АРТ-вакацыі» ўзялі ўдзел лепшыя творчыя калектывы і індывідуальныя выканаўцы (пераможцы абласных і мінскага гарадскога конкурсаў) — усяго больш як 6 тысяч студэнтаў з 53 ВНУ, якія дэманстравалі свае таленты ва ўсіх жанрах і накірунках мастацкай творчасці. Гран-пры «Арт-вакацый» «Хрустальны флайер» атрымала тэматычная праграма Брэсцкай вобласці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

З месца падзей

# ТАНЦЫ ВУЛІЦ — МАРА ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?..

**Сонца, па-летняму пякучае і бесклапотнае, сумленна падтрымлівала дзіўнае мерапрыемства ў цэнтры горада. Сюды адважна і з інтарэсам падыходзілі дзеці і дарослыя, іграла прыемная дыджэйская музыка, каталіся ролеры-самавучкі... Адразу ўспомніўся амерыканскі фільм «Танцы вуліц» з усімі характэрнымі момантамі і дзеямі. Але ж у нашай краіне!? Цяжка паверыць, але і мы дачакаліся!**

Упершыню ў Мінску, афіцыйна і адкрыта, на перакрыжаванні вуліц Няміга і Гарадскі вал, майстры графіці размалёўвалі білборды, танцавалі прафесіяналы па брэйк-дансе і хіп-хопе. Мерапрыемства, якое шырока не рэкламавалася, на дзіва, сабрала вельмі шмат моладзі. На некалькі гадзін заўсёды спакойная частка горада ператварылася ў сапраўдную вулічную сцэну з усімі яе атрыбутамі. Пакуль размалёўвалі білборд, вядучыя нікому не давалі засумаваць нават на хвілінку. Батлы паміж камандамі танцораў чаргаваліся з цікавымі конкурсамі «Моладзь у стылі «Шок», «Лепшы аматарскі танец», «Лепшы спартыўны абутак» і іншыя. Тэмпература на пляцоўцы была ні ніжэй за паказчыкі тэрмометра. Ветлівая публіка была не проста рада, а сапраўды падтрымлівала атмасферу святочнасці, вулічнай прастаты і свабоды.

Танцы вуліц... Знакамітыя каманды па брэйк-дансе Street Masters, Hunters, Despoilers таксама з задавальненнем падтрымалі гэтую акцыю. Энергія ад іх танцаў распаўсюджвалася, здаецца, на шмат кіламетраў, а дыджэйскія сэты не толькі ўражвалі незвычайнасцю, але і натхнялі. Падчас правядзення мерапрыемства майстры графіці працягвалі размалёўваць білборд. **Свабодна, альтэрнатыўна, без каментарыяў...** У выніку праз некалькі гадзін прама ў цэнтры горада нарадзіўся яшчэ адзін шэдэўр вулічнага мастацтва. Яркі, насычаны рознакаляровымі фарбамі, майстэрскі. Як словы моладзі — па-летняму вясёлай і сапраўды таленавітай.

Гэта мерапрыемства цікавае яшчэ і тым, што яно ахопіць не толькі адзін дзень, а тры летнія суботы. Адна з іх, якая ўжо прайшла, у поўнай меры даказала, што ўсё гэта не дарэмна. Яшчэ два вялізныя білборды чакаюць свайго часу, рук нефармальных мастакоў. А падтрымаюць іх не толькі ўсе ахвотнікі, але і экстрэмальныя ролеры, скейтары і танцоры. **Сумна не было — сумна не будзе!**

**Дзіяна АРЫПАВА.**



Абітурыент-2008

# На ЦТ трэба захапіць пропуск, ручку і гадзіннік

**Менш як тыдзень застаўся да афіцыйнага старту ў Беларусі прыёмнай кампаніі. У бліжэйшыя выхадныя ў беларускіх школах пройдуць выпускныя вечары, а затым усе абітурыенты зноў сядуць за падручнікі і канспекты. Першымі ў аўдыторыі, дзе будуць праходзіць тэставыя выпрабаванні, прыйдуць 12 чэрвеня маладыя людзі, якія пажадалі здаваць пры паступленні беларускую мову. На шчасце, правядзенне ўступных іспытаў у форме цэнтралізаванага тэсціравання стала для абітурыентаў ужо звычайнай справай, і большасць з іх псіхалагічна гатовыя да такіх выпрабаванняў. Тым не менш некаторыя сумненні ўсё яшчэ застаюцца. Таму паспрабуем з дапамогай супрацоўнікаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў зняць пераважную большасць пытанняў, якія датычацца непасрэдна працэдуры правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.**

***— ЦІ МОЖНА ПРАЙСЦІ ЦТ БЕЗ ПАШПАРТА, ПРАД'ЯВІЎШЫ ЯГО НАТАРЫЯЛЬНА ЗАВЕРАНУЮ КОПІЮ?***

На тэсціраванні абітурыент павінен мець пры сабе арыгінал дакумента, які сведчыць яго асобу (пашпарт, пасведчанне на права жыхарства ці пасведчанне бежанца), па якім ён праходзіў рэгістрацыю. Удзельнік тэсціравання абавязаны з'явіцца ў пункт тэсціравання не пазней чым за 30 хвілін да пачатку ЦТ і мець пры сабе запоўнены і зарэгістраваны пропуск на прадмет, па якім праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне, дакумент, які сведчыць яго асобу, а таксама гелевую ці капілярную ручку з чарніламі чорнага колеру. У выпадку адсутнасці ў абітурыента пропуска адказны сакратар праводзіць зверку дакумента, які сведчыць асобу, з базай даных абітурыентаў. Абітурыенту, які раней быў зарэгістраваны, афармляецца дублікат пропуска. Асоба, якая не была раней зарэгістравана, да праходжання ЦТ не дапускаецца. Абітурыентам трэба мець на ўвазе, што не заўсёды пункты рэгістрацыі супадаюць з месцам правядзення тэсціравання, таму ім неабходна ўважліва прачытаць на сваім пропуску адрас і месца правядзення ЦТ, каб не спазніцца на экзамен. Абітурыент, які прыйшоў на тэсціраванне пасля таго, як быў распячатаны пакет з педагагічнымі тэстамі, у аўдыторыю не дапускаецца.

***— ХТО МОЖА ПРАЙСЦІ ТЭСЦІРАВАННЕ Ў РЭЗЕРВОВЫ ДЗЕНЬ?***

Толькі тыя абітурыенты, якія прапусцілі ЦТ па ўважлівых прычынах (з-за хваробы ці форс-мажорных абставінаў). Але ўважлівасць прычыны пропуску яны абавязаны будуць пацвердзіць дакументальна.

***— З ЯКОГА МОМАНТУ ВЯДЗЕЦЦА АДЛІК ЧАСУ НА ВЫКАНАННЕ ТЭСТА?***

Пасля размяшчэння абітурыентаў у аўдыторыях згодна з праведзенай жараб'ёўкай адказны арганізатар распячатвае пакет з бланкамі адказаў. Абітурыенты запаўняюць вобласць рэгістрацыі бланка адказаў (на той мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі) і запісваюць нумар бланка адказаў у свой пропуск. Пасля запаўнення ўсімі абітурыентамі вобласці рэгістрацыі распячатваюцца пакеты з педагагічнымі тэстамі. Атрымаўшы педагагічны тэст, абітурыент павінен пераканацца ў адпаведнасці нумару свайго варыянта бланка адказаў варыянту педагагічнага тэста. Пачаткам адліку часу, адведзенага на выкананне педагагічнага тэста, з'яўляецца час атрымання апошняга экзэмпляра педагагічнага тэста. Час пачатку і завяршэння работы над выкананнем педагагічнага тэста фіксуецца ў пратаколе. Адказны арганізатар інфармуе абітурыентаў за 15 і 5 хвілін да заканчэння часу, адведзенага на выкананне педагагічнага тэста. Датэрміновая здача экзаменацыйных матэрыялаў спыняецца за 15 хвілін да заканчэння тэрміну, адведзенага для выканання педагагічнага тэста.

***— ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ Ў БЛАНКУ АДКАЗАЎ ЧАСТКІ В НЕ ХАПАЕ КЛЕТАЧАК?***

Кожнае поле трэба запаўняць, пачынаючы з першай клетачкі. Адказ трэба даваць у кароткай форме (слова, словазлучэнне ці цэлая лічба). Кожная лічба, літара ці знак мінус (калі лічба адмоўная) запісваюцца ў асобную клетачку. Адказ, які складаецца з двух слоў, пішацца злітна, без прабелу, дэфіса ці іншага раздзяляльнага знака. Калі літар у такім слове акажацца больш, чым клетачак на полі, то другую частку слова можна пісаць больш сцісла, не захоўваючы пападанне ў клетачкі.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «Ч.З.»)***

# БЕЛАРУСЬ. АРМІЯ. ДЗЯЎЧЫНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

### ПАТРЫЯРХАТ

І гэтым усё сказана. Армія — калыска патрыярхату.

— Працяглы час курсанты-мужчыны ставіліся да нас прадузята. Яны лічылі, што мы імкнёмся заняць не сваё месца, што дзяўчыне не месца ў арміі. Вельмі цяжка было пераадольваць гэты стэрэатып. Часта з-за гэтага ўзнікалі канфлікты. Напрыклад, нас не прымалі ў каманду КВЗ. Дакладней: дзявочыя кандыдатуры нават не разглядаліся. Даводзілася ўвесь час даказваць, што мы чагосьці вартыя, што мы можам служыць, працаваць на роўных з мужчынамі.

К трэцяму курсу атмасфера ў групе разрадзілася. Завязалася сяброўства. Актыўная і таварыская Алена ўзяла на сябе ролю арганізатара адпачынку. Разам з сяброўкай яна даставала білеты ў тэатр, кіно. Разам агітавалі групу наведаць цікавую выставу. Праз паўгода можна было смела казаць, што хлопцаў і дзяўчат у акадэміі не разліць вадой.

### ЧАРАЎНІЦА

Цяпер лейтэнант Алена Жукоўская працуе ў Галоўным інфармацыйна-вылічальным цэнтры Узброеных Сілаў Беларусі. Для вайскоўца гэта адказна і прэстыжна. Права на працу тут ёй даў дыплом з адзнакай, з якім Алена скончыла Ваенную акадэмію. Дзяўчыну замацавалі за аддзелам тэхнічнага забеспячэння сродкаў вылічальнай тэхнікі. Гэта значыць, калі раптам у любым з кабінетаў Міністэрства абароны пачне «капрызіць» камп'ютар, тут жа з'явіцца мілавідная светлавалосая дзяўчына з прыемнай усмешкай і нібы ўзмахам чароўнай палачкі разбярэцца з любой непаладкай.

— Я была здзіўленая сваім размеркаваннем, — прызнаецца «чараўніца». — У акадэміі спасцігала ўсе тонкасці сістэмнай апрацоўкі інфармацыі, а ў цэнтры давялося працаваць непасрэдна з тэхнікай. Так, гэта было нечакана, таму што крыху не па спецыяльнасці. Добра, што акадэмія навучыла не палохацца цяжкасцяў. Я зменшыла свае амбіцыі, вырашыла: калі не ведаю — спытаю. Далібог, калектыў цудоўны: чатыры дарослыя спрактыкаваныя мужчыны, якія прынялі мяне даволі ветліва. Тут неабходна трымацца на належным узроўні, увесь час удасканальвацца. Калі ёсць магчымасць, бяруся за складаныя выпадкі, адказныя заданні. А як яшчэ іншым спосабам змагу спасцігнуць штосьці новае?

### СЁННЯ

Сёння Алена тройчы на тыдзень наведвае курсы англійскай мовы, вучыцца гуляць у тэніс, рэгулярна ходзіць у басейн.

Сёння яна цікавіцца псіхалогіяй, чытае Шэкспіра і Набокава, Экзюперы і Талстога, захапляецца Мадоннай як жанчынай і творцай, марыць пра падарожжы і пра тое, каб калі-небудзь напісаць кнігу.

— Я не разумею людзей, якія не хочуць адкрываць для сябе новыя гарызонты, якія гавораць: «А нашто мне гэта трэба?» Яны пражываюць сваё жыццё «як атрымаецца, як усе». А я лічу, што не трэба азірацца на навакольных, ісці за натоўпам, трэба шукаць свой шлях. Трэба вучыцца, пашыраць свой кругагляд. Не даваць сабе духоўна скамянець. Калі я за дзень не зраблю штосьці карыснае, не павялічу аб'ём сваіх ведаў, то з'яўляецца адчуванне, што гэты дзень прайшоў міма мяне. Я хацела б пайсці на курсы дызайну, хацела б навучыцца маляваць... Да гэтага часу шкадую, што ў шостым класе не паслухала бацькоў і адмовілася ад навучання ў музычнай школе. Сёння б ужо валодала якім-небудзь музычным інструментам. Вельмі хочацца, каб ніколі не сыходзіла на нішто вось гэтая прага спазнаваць, вучыцца, адкрываць для сябе цікавае, новае...

Для Алены адкрыты любы шлях у гэтым жыцці. Таму што яна не стаіць на месцы ў чаканні цуду. Яна сама яго стварае.

### І ЗАЎТРА

Алена не любіць планаваць сваю будучыню.

— Я, напэўна, фаталіст, — прызнаецца яна. — Я лічу, што твой лёс цябе абавязкова знойдзе. Я, хутчэй, не планую, а стаўлю мэты. На кожную мэту выдзяляю пэўны тэрмін. Прычым тэрмін стаўлю максімальна кароткі, бо гэта вельмі дысцыплінуе і мабілізуе. Акадэмія навучыла настойлівасці і вытрымцы. Рэдка, калі штосьці не атрымліваецца.

Летам Лена збіраецца паступаць у магістратуру Ваеннай акадэміі. Як вы лічыце, яна здолее гэта зрабіць?..

***

Якая ж яна, жанчына з пагонамі? У першую чаргу — Асоба. Разумная, настойлівая і адкрытая. Як мінімум. Пяшчотная кветка з моцным унутраным стрыжнем.

**Таццяна ДАНІЛУШКІНА.**

# На ЦТ трэба захапіць пропуск...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— КАЛІ ПРЫ АДКАЗЕ НА ЗАДАННІ ЧАСТКІ В АДКАЗ БУДЗЕ ЎТРЫМЛІВАЦЬ АРФАГРАФІЧНУЮ ПАМЫЛКУ, ЦІ БУДЗЕ ЁН ЗАЛІЧАНЫ?***

Арфаграфічныя памылкі ў адказе не дапускаюцца. Адказ (слова ці словазлучэнне) даецца ў форме (род, лік, склон), якія вызначаюцца ўмовай тэставага задання і на той мове, якая была абрана для экзамену.

***— ЦІ ДАЗВАЛЯЕЦЦА ЗАМЕНА БЛАНКА АДКАЗАЎ У ВЫПАДКУ ДАПУШЧАНАЙ ПАМЫЛКІ?***

Замена бланка адказаў не прадугледжваецца інструкцыяй па правядзенні ЦТ. Для адмены памылковага і ўказання правільнага адказу трэба: адмяніць метку, указаўшы нумар тэставага задання і нумар памылкова выбранага варыянта; паставіць метку ў патрэбнай клетачцы слупка тэставага задання. Забараняецца выпраўляць метку графічным спосабам (заштрыхоўваць) ці замазваць карэктарам. Адмена памылковай меткі робіцца ў полі адмены памылковых метак. У адным тэставым заданні можна адмяніць не больш як два памылковыя адказы. Усяго можна адмяніць не больш як шэсць памылковых метак.

***— ПА ЯКІХ ПРЫЧЫНАХ АБІТУРЫЕНТА МОГУЦЬ АДХІЛІЦЬ АД УДЗЕЛУ Ў РЭПЕТЫЦЫЙНЫМ ТЭСЦІРАВАННІ?***

Абітурыентам забараняецца праносіць, а таксама выкарыстоўваць у аўдыторыі, дзе праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне, кнігі, сшыткі, запісы, сумкі, мабільныя тэлефоны, пэйджары, электронныя запісныя кніжкі, камп'ютары і іншыя сродкі захоўвання, прыёму і перадачы інфармацыі.

Мабільныя тэлефоны абавязкова здаюцца арганізатарам пры ўваходзе ў аўдыторыю. Калі вы гэта не зробіце і ваш мабільнік раптам зазвініць на экзамене, то на міласэрнасць арганізатараў тэсціравання лепш не разлічвайце. Абітурыентам забараняецца фальсіфікаваць даныя ў вобласці рэгістрацыі бланка адказаў, мяняцца месцамі, выкарыстоўваць чужую дапамогу пры выкананні тэставых заданняў, размаўляць з іншымі ўдзельнікамі ЦТ. Калькулятарам дазваляецца карыстацца толькі на тэсціраванні па фізіцы і хіміі, прычым калькулятар павінен быць з самымі простымі вылічальнымі функцыямі. Арганізатары забараняюць выкарыстоўваць інжынерныя, графічныя калькулятары, а таксама ўсе калькулятары, убудаваныя ў іншыя прыборы, напрыклад, у электронныя запісныя кніжкі, мабільныя тэлефоны і г.д. Абітурыент, які парушыў устаноўленыя патрабаванні, адхіляецца ад удзелу ў ЦТ. Бланк адказаў пагашаецца шляхам перакрэслівання па дыяганалях, а ў пропуску робіцца пазнака «Выдалены за парушэнні».

***— ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ РАПТАМ НЕ ХОПІЦЬ ВЫДАДЗЕНАЙ ДЛЯ ЧАРНАВІКА ПАПЕРЫ? І ЦІ МОЖНА ПА ЎВАЖЛІВАЙ ПРЫЧЫНЕ ПАКІНУЦЬ АЎДЫТОРЫЮ ПАДЧАС ЭКЗАМЕНУ?***

— Не хвалюйцеся, паперы для рабочых запісаў павінна выдавацца столькі, колькі вам спатрэбіцца. Яе колькасць ніхто не абмяжоўвае. Але пры выхадзе з аўдыторыі абсалютна ўсе экзаменацыйныя матэрыялы і свае запісы, у тым ліку і ўсе чарнавікі, абітурыент павінен здаць арганізатарам.

У выпадку, калі абітурыенту экстранна спатрэбіцца выйсці ў прыбіральню, ён можа здаць экзаменацыйную работу арганізатарам, затым у суправаджэнні супрацоўніка пакінуць аўдыторыю, вярнуцца і прадоўжыць выпрабаванне. Аднак абітурыент губляе час, які даецца для выканання тэста.

***— ЦІ МОЖА АБІТУРЫЕНТ АБСКАРДЗІЦЬ ВЫНІКІ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ?***

Абітурыент мае права ў працэсе тэсціравання заявіць арганізатарам, што нейкае заданне, паводле яго меркавання, складзена некарэктна, у ім утрымліваецца памылка ці не прыведзена правільных адказаў. Усе прэтэнзіі заносяцца ў пратакол з указаннем нумара варыянта педагагічнага тэста, нумара задання і зместу заўвагі. Кожная заўвага пасля завяршэння тэсціравання правяраецца, і калі раптам пацвердзіцца яе справядлівасць, то ўсім удзельнікам тэсціравання гэта заданне будзе залічана як правільна выкананае.

Пытанні абітурыентаў наконт зместу педагагічных тэстаў у аўдыторыі не разглядаюцца. Працэдура апеляцыі на цэнтралізаваным тэсціраванні не прадугледжана.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Захапленне

# Насця. Коні. Каратэ

**Людзі трацяць грошы на адзенне, на кнігі, ежу... Гэтая дзяўчына трацiць свае грошы на коней. У асноўным — на свайго любімца — Тэолага. Некалькі разоў на тыдзень ездзіць з Шабаноў у Калодзішчы да яго і яго сяброў.**

Насця Воінава — студэнтка 3-га курса факультэта журналістыкі БДУ. Сціплая дзяўчынка. Невялікая ростам, у сабе яна трымае непамерную моц і мужнасць. Сем гадоў таму выпадкова Насця ўбачыла аб'яву пра адзін з конных клубаў. Закарцела паглядзець. Паглядзела — і засталася. Дзяўчына згодная гадзінамі размаўляць пра коней. Сябры ведаюць яе любоў, таму пытання наконт падарункаў ніколі не ўзнікае. Нават старонкі канспектаў размаляваныя коньмі. Сёння Насця ўжо не ездзіць у той клуб. Яна займаецца ў Беларускім грамадскім аб'яднанні верхавой язды і іпатэрапіі (БГАВЯІ), што размешчана ў Калодзішчах. Тут знаходзіцца Насціна любоў — Тэолаг. Рускі рысак васемнаццаці гадоў.

Не проста пакатацца гойсае Насця да сваіх выхаванцаў. Накарміць. Напаіць. Пачысціць прыгажуноў ды іх стойла. Калі трэба, зрабіць укол. Нават не верыцца, калі бачыш, як дзяўчына цягне вядро з вадой. Пачынаеш хвалявацца, калі бачыш, як яна са шпрыцам у руцэ заходзіць у стойла да каня. Ён жа на некалькі дзесяткаў сантыметраў вышэй за яе. Смела і рашуча робіць сваю справу. Да таго ж ласкава і пяшчотна размаўляе з кожным канём. Да кожнага з іх патрэбны свой падыход. Насця за некалькі хвілін можа расказаць пра асаблівасці сваіх сяброў. Поспех — бясспрэчны лідар сярод астатніх. Ён самы дужы і вялікі. Полька Мадлен, як сапраўдная жанчына, патрабуе да сябе асаблівай павагі і пяшчоты. Малады Арцём (сын Мадлен) часта сваволіць... І так пра ўсіх шасцярых. А вось Тэолаг — яе боль. Некалі Насця выкупіла гэтага каня. Кажа, палюбіла, ды балюча было глядзець, як з ім абыходзяцца. Цяпер яна даглядае яго і вучыць, каб той мог, як і іншыя коні БГАВЯІ, выкарыстоўвацца для заняткаў іпатэрапіяй.

Яшчэ адна Насціна слабасць — каратэ. Некалі ў школе яна пачынала займацца таэквандо, ды была праблема з грашыма. Цяпер Насця ходзіць у спартыўную секцыю БДУ, дзе ёсць магчымасць займацца бясплатна. Хай яна яшчэ не заваявала вялікіх узнагародаў у спаборніцтвах, але ж стала больш моцнай. На трэніроўкі дзяўчына ходзіць кожны дзень. Адкуль у яе столькі энергіі?



У той жа час Настасся не забываецца на выбраную прафесію. Яна супрацоўнічае з адной з мінскіх газет. Усё паспявае. Яна шчаслівая. Але, на жаль, бацькі не падзяляюць Насціных захапленняў ні спортам, ні коньмі. Кажуць: дарэмная страта часу. А так важна, каб нашы блізкія падтрымлівалі нас. Яшчэ адна праблема — грошы на ўтрыманне коней. Насці, як і астатнім дзяўчатам, што ездзяць у канюшню, грошай не плацяць. Усё гэта — валанцёрская праца. Таму яны ўвесь час чакаюць для сваіх падапечных любую падтрымку. Бо так хочацца, каб як мага больш дзетак былі здаровымі дзякуючы іх коням. Насця з хваляваннем расказвае пра свае першыя прагулкі з дзецьмі. Вялікае напружанне. Коні, здаецца, адносяцца да гэтага больш спакойна.

Гэта ўсё — Насціна жыццё. Коні. Каратэ. Вучоба. Яна спраўляецца. І неяк дзіўна цяпер чуць, што ў кагосьці не хапае часу. Галоўнае, правільна яго размяркоўваць.

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА.**
**Фота аўтара.**

# СЛЕД ДАБРЫНІ НА ЧУЖОЙ ЗЯМЛІ

**З кожным годам на вуліцах горада ўсё часцей можна сустрэць людзей з іншым колерам скуры, разрэзам вачэй... Прыязджаюць іншаземцы ў Беларусь па розных прычынах: працаваць, вучыцца, адпачываць... Госці ж, як і гаспадары, могуць быць самымі рознымі. Адны грэбуюць беларускай культурай, засмечваюць вуліцы, іншыя, наадварот, цікавяцца гісторыяй нашай краіны, з задавальненнем расказваюць беларусам аб сваёй радзіме, па ўласным жаданні дапамагаюць людзям з абмежаванымі магчымасцямі і дзецям, пазбаўленым бацькоўскай пяшчоты...**

### АДЗІНАЯ ПРАБЛЕМА — ХІДЖАБ



Са спадарыняй **Зейнаб Эльгодж,** жонкай былога пасла Лівіі ў Беларусі, кіраўніком Міжнароднага клуба жонак замежных паслоў і маці 5 дзяцей па сумяшчальніцтву я сустрэлася напярэдадні яе ад'езду на радзіму (у сувязі з завяршэннем дыпламатычнай місіі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Сацыялістычнай Народнай Лівійскай Арабскай Джамахірыі ў Рэспубліцы Беларусь Абдалы Альмагравi. — **Н.Д.**).

— Асноўны накірунак дзейнасці нашага клуба — дабрачыннасць. Дапамагаем дзецям-інвалідам, сіротам з дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў, дзецям, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. Часам там не хапае нават элементарных сродкаў гігіены, канцылярскіх тавараў. Але самае каштоўнае — увага. Таму мы стараемся не толькі забяспечыць сваіх падапечных матэрыяльнымі дабротамі, але і падзяліцца з імі чалавечай цеплынёй.

— А адкуль бераце грошы, каб ладзіць дабрачынныя акцыі? — цікаўлюся.

— Галоўным чынам, з індывідуальных ахвяраванняў. Акрамя таго, штогод у снежні ладзім дабрачынны кірмаш, а ў сакавіку — дабрачынную вячэру, у якіх прымае ўдзел і жонка прэм'ер-міністра Беларусі Людміла Сідорская.

Жанчыны клуба, як правіла, праводзяць летні адпачынак на радзіме, адкуль і прывозяць сувеніры, прадметы нацыянальных промыслаў. На традыцыйных мерапрыемствах гэта ўсё прадаецца, разыгрываецца пры дапамозе латарэй. Усе сродкі, якія выручылі, ідуць на дабрачынныя патрэбы: падарункі дзецям у падшэфных дамах-інтэрнатах, бальніцах.

— Сябруем са школай-інтэрнатам у Валожыне, дашкольным дзіцячым домам у Жодзіне, Барысаўскім домам дзіцяці, з дзецьмі, якія трапілі ў Мінскі дзіцячы хоспіс... — пачала пералічваць мая суразмоўца. — З кожным годам колькасць дабрачынных праектаў павялічваецца, пры гэтым мы не абдзяляем увагай сваіх ранейшых сяброў.

Акрамя таго, што члены Мінскага клуба займаюцца дабрачыннасцю, яны штомесяц арганізоўваюць цікавыя мерапрыемствы для сваіх калег: усе разам наведваюць беларускія прадпрыемствы, паказы моды, культурныя ўстановы. Усё гэта робіцца для таго, каб дапамагчы жонкам паслоў і дыпламатаў як мага хутчэй прыжыцца ў чужой краіне.

— Зейнаб, а з якімі цяжкасцямі сутыкнуліся асабіста вы, калі сем гадоў таму прыехалі ў Беларусь?

— Так як я з'яўляюся жонкай пасла ўжо не першы год, то да жыцця ў дарозе я прызвычаілася даўно. Яшчэ ў часы Савецкага Саюза жылі з мужам ва Украіне, у Маскве. Менавіта там я і асвоіла рускую мову. Таму, калі прыехалі ў Беларусь, моўных цяжкасцяў не ўзнікала. Адзіная праблема, з якой я сутыкнулася, — гэта хусцінка. Сем гадоў таму ўсе на мяне глядзелі са здзіўленнем. Гуляем мы, напрыклад, па горадзе, а насустрач ідуць дзве дзяўчыны маладыя, адна заўважыла і паказвае другой: «Паглядзі». Мяне гэта спачатку вельмі хвалявала. Муж супакойваў: «Яны не супраць хіджаба (традыцыйная ісламская галаўная хусцінка), праяўляюць да цябе павышаны інтарэс, бо для беларускай культуры не характэрна пакрываць галаву хусцінкай. Сапраўды, у 1996 годзе беларусы пра мусульман мала ведалі. Цяпер жа ў Беларусі шмат мусульман, дзяўчаты выходзяць за іх замуж і таксама апранаюць хіджаб, шмат інфармацыі людзі атрымліваюць праз Інтэрнэт, фільмы.

А так мне тут вельмі падабаецца. Беларусы, з якімі мяне звёў лёс, вельмі добрыя і гасцінныя. Нягледзячы на адрозненне ў традыцыях, у Лівіі, напрыклад, 8 сакавіка не святкуюць, як у Еўропе, мы віншуем беларускіх сяброў з іх святамі, а яны нас з нашымі.

### ВОПЫТ, ЯКІ НЕ ВЫМЯРАЕЦЦА ГРАШЫМА



Нямецкая арганізацыя добраахвотнай працы моладзі адправіла ў гэтым годзе 140 валанцёраў у розныя краіны, 9 з іх працуюць цяпер у Беларусі. З адным з іх, Рубенам, я вас і пазнаёмлю.

— У Германіі ёсць такое паняцце, як валанцёрскі сацыяльны год: выпускнікі школ не ідуць адразу ва ўніверсітэт, а на працягу дзевяці месяцаў працуюць у нямецкіх бальніцах ці дзіцячых садках, хлопцы могуць таксама пайсці служыць у армію. Лічыцца, што набыўшы новы, кардынальна адрозны вопыт, лягчэй вызначыцца наконт будучага роду дзейнасці.

— Я ж вырашыў правесці свой сацыяльны год (у іншай краіне ён доўжыцца дванаццаць месяцаў) у Беларусі. Цікава пазнаёміцца з іншай краінай. Рускую мову вывучаў у школе, таму ёсць магчымасць папрактыкавацца.

Цяпер хлопец працуе ў інтэрнаце для дзяцей з адхіленнямі, што ў Навінках. Тры разы на тыдзень наведвае аддзяленне для хлопчыкаў.

— Мае выхаванцы ўсе розныя, з рознымі дыягназамі, таму да кожнага трэба знаходзіць індывідуальны падыход. З аднымі малюю, з іншымі, калі добрае надвор'е, гуляю ў футбол, а Міша, напрыклад, просіць проста паразмаўляць з ім. З глухімі дзецьмі размаўляю мовай жэстаў. А Паша нават ведае некалькі слоў па-нямецку і па-англійску.

Адзін раз на тыдзень Рубен працуе ў інтэрнаце для дарослых людзей з абмежаванымі магчымасцямі, што ў Дражні.

— Для старэйшых людзей, у адрозненне ад дзяцей, самае важнае не гульня, і не размовы, а проста фізічная дапамога. Я выводжу інвалідаў-калясачнікаў на прагулку, пры гэтым уважліва слухаю тое, што яны расказваюць. Для іх важна адчуваць, што яны не адны. Часам просяць прывезці каву, гарбату. А адзін хлопец піша вершы, якія просіць мяне чытаць услых.

Акрамя таго, валанцёр дапамагае Маладзёжнай альтэрнатыўнай арганізацыі «Розныя-роўныя».

— Наладжваю кантакты па Інтэрнэце з замежнымі фондамі і арганізацыямі, якія могуць аказаць беларусам фінансавую падтрымку. Дапамагаю ў арганізацыі семінараў, суправаджаю на іх людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

— Ці апраўдаліся твае чаканні ад гэтай паездкі ў Беларусь, з якімі цяжкасцямі сутыкнуўся на першых парах?

— Дапамаглі асвоіцца валанцёры, якія працавалі тут да мяне, яны паказалі горад, пазнаёмілі з работай. У складаных сітуацыях звяртаюся ў Лігу добраахвотнай працы моладзі, арганізацыю «Розныя-роўныя», Беларускаю арганізацыю дапамогі дзецям-інвалідам. Цяжкавата спачатку было размаўляць па-руску, бо школьныя веды ніколі не было магчымасці прымяніць на практыцы. У Беларусі нам выдзелілі настаўніцу, якая два разы на тыдзень займаецца з кожным валанцёрам рускай мовай.

Я не сяджу на месцы, у выхадныя наведваю з сябрамі беларускія гарады, пабываў ужо і ў Варшаве, і ў Вільнюсе. Шмат цікавага даведаўся пра Беларусь і беларусаў ад людзей, з якімі працую. Раней, да паездкі ў Беларусь, хацеў стаць дыпламатам. Цяпер жа сумняваюся ў правільнасці свайго выбару, магчыма, атрымаецца знайсці больш цікавую работу.

### НАСТАЎНІЦА З КІТАЯ

У БДУ з кожным годам колькасць замежных студэнтаў, пераважна кітайскіх, расце. У гэтым можна пераканацца па колькасці хлопцаў у яркіх майках, якія гуляюць у футбол ля студэнцкага інтэрната, колькасці кітайскіх студэнтаў у аўтобусе, па дарозе ў гіпермаркет «ПРАСТОР».

Зайшла ў адзін з пакояў інтэрната № 10, каб пацікавіцца, дзе можна знайсці кітайца, які добра валодае рускай мовай. Дзверы мне адчыніла кітаянка. «Я Насця, — назвала яна сваё імя. — А вам каго?

За кубкам зялёнай кітайскай гарбаты я даведалася, што дзяўчынка сама прыдумала сабе рускае імя.

— Так робяць многія, бо нашы імёны беларусы не адразу запамінаюць. У першы дзень, калі мы прыйшлі ва ўніверсітэт, куратар прыдумала ўсім рускія імёны. Мне выпала імя Марта. А так як мне гэта імя не спадабалася, я вырашыла стаць Насцяй.



**Ду Цзюань** (сапраўднае імя дзяўчыны) ў Беларусі жыве ўжо пяць гадоў, вучыцца на рускім аддзяленні філалагічнага факультэта. У пакоі жыве з дзяўчатамі , якія таксама вучацца на філфаку. Але па спецыяльнасці «кітайская ўсходняя філалогія».

— Тэарэтычныя веды, якія мы атрымліваем на факультэце, дома замацоўваем на практыцы. Суседкі ўжо не здзіўляюцца, калі чуюць, як мы гаворым то па-кітайску, то па-руску.

Паехаць вучыцца ў Беларусь Насці параіла сяброўка, якая тут вучылася раней.

— Спачатку было трошкі страшнавата. Рускай мовы не ведаю, вакол усё новае. Пашанцавала, што з самага пачатку строгая выкладчыца трапілася (проста некаторыя без нагляду бацькоў адчуваюць свабоду і не наведваюць заняткі). Таму я старалася вучыцца.

— Цяпер, калі я асвоілася тут, у мяне з'явілася больш вольнага часу. Дзяўчынка з журфака папрасіла мяне дапамагчы ёй вывучыць кітайскую мову. Я раблю гэта з задавальненнем. Акрамя таго, выкладаю кітайскую мову разам з Карыянай беларускім школьнікам, у той жа школе вяду гурток па інтарэсах. Гурток наведваюць, у адрозненне ад абавязковых урокаў, толькі зацікаўленыя дзеці. Прыемна, што беларускія дзеці стараюцца, што хочуць ведаць нашу мову.

...

Беларусы едуць за мяжу, іншаземцы прыязджаюць у нашу краіну. Так ідзе абмен вопытам, ведамі, поглядамі на жыццё і чалавечнасцю. І праўду кажуць, што не месца ўпрыгожвае чалавека. Няхай будзе больш добрых слядоў не толькі на сваёй зямлі, але і на чужой.

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота аўтара.**

## ДЫЯЛОГ РОЎНЫХ

**Нацыянальны дзіцячы форум «Дзеці Беларусі: мы выбіраем здароўе» прайшоў у Мінску.**

Удзел у форуме ўзялі 150 прадстаўнікоў вучнёўскага самакіравання, а таксама членаў дзіцячых і маладзёжных грамадскіх арганізацый з усіх рэгіёнаў Беларусі. Гасцямі форуму былі прадстаўнікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, органаў дзяржаўнага кіравання і рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў.

Нацыянальны дзіцячы форум — найбольш эфектыўная і сучасная форма арганізацыі дыялогу дзяцей і дарослых, якая дае магчымасць для абмеркавання актуальных сацыяльных праблем.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# *Ду ю спік інгліш? Не?*

## У студэнцкіх кулуарах колькі часу ходзяць чуткі: наступны навучальны год (кожны раз новы) пагражае скарачэннем гадзін вывучэння замежнай мовы

**Як растлумачыць змены, што прадбачацца, братам-студэнтам? Беларускаму грамадству ведаць больш за тое, што ёсць, немагчыма? Замежная мова засвоена ім на «выдатна»? Цікавасць «заела»!.. Які адказ я атрымаю на пытанне: «How can I come to the railway station?». У перакладзе па-беларуску: «Як мне прайсці да чыгуначнага вакзала?» Ці атрымаю адказ наогул? Паэксперыментуем?**

Паўгадзіны — і восем слоў скарыліся мне. Як чалавек, што з пятага класа вывучаў французскую мову, была задаволена мінімальна затрачаным часам. Наперадзе — мінскія вуліцы. Пошукі пачынаюцца.

«How can I come?..» — спыняю дзяўчыну на шляху з вуліцы Мяснікова да Маскоўскай. «Чаго?» — перапытвае тая. Раблю разумны выраз твару. Нарэшце дзяўчына здагадваецца, што пытанне прагучала не па-руску. «Sorry, не ведаю», — каротка кідае і спяшаецца знікнуць. Першы блін...

Насустрач ідзе мужчына гадоў пад сорак. «How can I come?..» — смела пытаюся. «Не зразумеў», — адказаў, як адрэзаў. «Ду ю спік інгліш?» — раблю апошнюю спробу завязаць размову. Фраза была зразумелая: «Не, зайчык, не ведаю». «Зайчык» тым часам ідзе на пошукі наступнай «ахвяры».

Сустрэлася яна мне каля галоўнага корпуса БДУ. На маё пытанне трасе адмоўна галавой. Падмацоўвае папярэдні нямы адказ кароткім «не-а». Ніякіх іншых слоў, відаць, мне не пачуць. За ўсё жыццё не бачыла, каб на мяне так рэагавалі — з жахам у вачах. Адыходжу, каб далей не нерваваць чалавека. Пакуль не атрымала адказ, справа не скончаная.

> ***Ходзяць чуткі, што...***
>
> *...з наступнага навучальнага года ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі колькасць гадзін вывучэння замежнай мовы зменшыцца ўдвая.*
>
> ***Кампетэнтна***
>
> ***Саветнік міністра адукацыі па сувязях са СМІ і грамадскасцю Віктар ІЎЧАНКАЎ:***
>
> *— Чуткі можна абвергнуць цалкам. Сёння распрацоўваецца праграма, згодна з якой усе спецыялісты павінны валодаць замежнай мовай. Гаворыцца аб пашырэнні яе вывучэння нават на будаўнічых спецыяльнасцях. Больш за тое, абмяркоўваецца пытанне аб увядзенні дзяржаўнага экзамену па замежнай мове ва ўсіх ВНУ і ССНУ.*

Пасля гадзіны безвыніковых пошукаў пачынаю вінаваціць сябе: недапрацавала акцэнт.

Без надзеі на поспех падыходжу да дзяўчыны, што чакае маршрутку.

— How can I come to the railway station?

— Railway station? — перапытвае мяне тая.

— Ага, — ад нечаканасці ледзь не выйшла з ролі.

Дзесьці на працягу хвіліны тлумачыць дарогу да вакзала, да якога сёння я не спяшаюся. Рукой дзяўчына паказвае на прыпынак. «Прапаноўвае мне скарыстацца гарадскім транспартам», — здагадваюся я і ківаю ў такт галавой, маўляў, усё зразумела.

Па шчырасці, з патоку незнаёмых слоў успрыняла на слых толькі «тралейбус» і «намбэр». Гуляць далей у англічанку не мела сэнсу. Цікаўлюся ў дзяўчыны крыніцай ведаў. Па-беларуску. Тут у справу ўмешваецца смех і перашкаджае дзяўчыне хутка сабрацца з думкамі.

— Замежную мову ведаю са школы, — дзеліцца інфармацыяй Віка ў здзіўленні ад англічанкі, зробленай у Беларусі. — Спецыяльных курсаў не заканчвала. Ва ўніверсітэце? Вывучаем... Так, трошкі.

...Адцягваю ўвагу дзяўчыны ад чытання аб'яў ужо вядомым пытаннем. Англійскія словы ўжо не пужалі. Выйсце адно: праўда і толькі праўда.

— Эксперымент? — усміхаецца Вольга. — Англійскую мову вывучала ў школе, зараз ва ўніверсітэце. Як маглі заўважыць, мне было цяжка размаўляць. Цяпер мы праходзім бізнэс-лексіку, таму словы «агульнай» тэматыкі паступова забываюцца.

Я ўжо сабралася ісці. Нават зрабіла некалькі крокаў.

— Як вы ставіцеся да таго, што будуць скарачацца гадзіны замежнай мовы? — пачулася мне ў спіну Вользіна пытанне.

Чуткі маюць не ногі, а крылы, якім пазайздросціла б безліч «высакахуткасных» птушак.

Цяжка перабольшыць ролю замежных моў. З імі беларускія спецыялісты стануць канкурэнтаздольнымі на рынку працы, адкрыецца доступ да сусветных тэхналогій... Пакуль хадзілі чуткі, вока неаднойчы касілася на аб'явы вучэбных курсаў, што прапанавалі вывучыць: італьянскую мову — за рулём, англійскую — бягом, французскую — метадам «пагружэння ў моўнае асяроддзе». За два тыдні, кваліфікаваныя спецыялісты, за мерную плату. Чаму б не? Шукаем выйсце са становішча. Скарачэнне ж ...

У студэнцкіх кулуарах ходзяць чуткі. Самыя розныя. Адна з іх так і застанецца — проста чуткай.

**Сняжана КАЎГАРЭНЯ.**

# ДК ДАНС У СТЫЛІ ІНЖЭСТА

Апошнім часам усё часцей на сталічных афішах з'яўляецца назва — «Інжэст». Спектаклі гэтага тэатра праходзяць заўсёды з аншлагам. Паспрабуем разабрацца, што ж так прываблівае беларускага гледача ў гэтых пастаноўках.

«Інжэст» — гэта тэатр без слоў, ён мае ў сваім арсенале такія прыёмы, як пантаміму, буфанаду, акрабатыку. З'яўленне «Інжэста» ў Беларусі — новы віток у тэатральным мастацтве. З упэўненасцю скажу, што гэта далёка не масавая тэатральная з'ява, ахвотнікам адпачыць і павесяліцца — дарога не сюды (тым не менш доля весялосці і смеху вам будуць гарантаваныя).

Нягледзячы на тое, што «Інжэст» з'яўляецца ў сваім родзе нават атарам, існуе ён даволі даўно. З моманту першага спектакля прайшло ні многа ні мала, а 20 гадоў. Тады тэатр быў вядомы пад назвай «Жэст». А з 2001 года стаў звацца «Інжэстам»

Адным з культавых спектакляў тэатра з'яўляецца «Дк Данс». Спектакль-хроніка «заняпалага» карнавалу, дзе акцёры выступаюць з ходулямі на нагах. Увесь драматызм і трагізм сюжэту ў тым, што «заняпалы» карнавал не можа ўзняцца, ён бяссільны і насцярожана ставіцца да дапамогі звонку. Дэкаданс тут праяўляецца ва ўсім: і ў апатыі да жыцця галоўных герояў карнавалу, і ў іх маральным заняпадзе, і нават у тым, што яны не прымаюць дапамогу, якая з'яўляецца ключом да выратавання.

Глыбіню «Дк Данса» немагчыма было б перадаць без прыёму танца Буто, у дакладным перакладзе з японскай — гэта танец з тупатам. Яго гісторыя пачынаецца яшчэ са старажытных эзатэрычных рытуалаў.

Цікавы факт: «Дк Данс» вельмі гарманічна існуе як мастацтва без слоў. Мабыць, толькі пры дапамозе невербальных акрабатычных прыёмаў і дасягаюцца тыя філасофскія і сацыяльныя ідэі, якія першапачаткова былі закладзены рэжысёрам-пастаноўшчыкам і выканаўцай галоўнай ролі «заняпалага» блазана, чалавека з вельмі незвычайным прозвішчам, Вячаславам Іназемцавым.

Складвалася ўражанне, што дзеянні адбываюцца ледзь не спантанна. Акцёры, нібы ўпадаюць у транс, а разам з імі — і гледачы. У спектаклі ўзнімаюцца праблемныя філасофскія пытанні, адназначных адказаў на якія няма.

**Юлія ЗНАК.**

## З заданнямі АДЭ справіліся толькі 4 працэнты расіян

**Кожны год пасля завяршэння ў Беларусі кампаніі па правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання ў краіне разгараюцца спрэчкі наконт складанасці прапанаваных абітурыентам тэстаў. Трэба заўважыць, што не менш гарачыя дыскусіі разгараюцца і ў нашых суседзяў-расіян, маўляў, як учарашнія школьнікі могуць справіцца з заданнямі Адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ), калі не ўсім дарослым яны пад сілу.**

Нядаўна, як паведамляе Інтэрнэт-рэсурс www.rb.ru, Усерасійскі цэнтр вывучэння грамадскай думкі вырашыў праверыць адукаванасць расіян, задаўшы ім пытанні з Адзінага дзяржаўнага экзамену па рускай мове, які выпускнікі расійскіх школ здавалі ў 2007 годзе. Вынікі аказаліся ашаламляльныя: на восем зусім нескладаных пытанняў правільна далі адказ усяго 4 (!) працэнты рэспандэнтаў. Не магла пахваліцца адукаванасцю нават група рэспандэнтаў з вышэйшай і незавершанай вышэйшай адукацыяй: толькі 7 працэнтаў апытаных у гэтай катэгорыі ведалі адказы на ўсе пытанні. 6 працэнтаў не далі ніводнага правільнага адказу.

Абсалютна неадукаваныя знайшліся і сярод людзей з вышэйшай адукацыяй: 1 працэнт апытаных з гэтай групы не далі правільны адказ ні на адно пытанне. У групе з адукацыяй ніжэй за сярэднюю такіх набралася 26 працэнтаў.

Прыблізна палова рэспандэнтаў стабільна давалі няправільныя адказы па кожным з пытанняў. Горш за ўсё ў расіян справы з пунктуацыяй: толькі трэцяя частка апытаных змаглі правільна паставіць коску ў сказе і патлумачыць, чаму яна там павінна быць. З гэтай задачай не справіліся 84 працэнты рэспандэнтаў з адукацыяй ніжэй за сярэднюю і 56 працэнтаў — з вышэйшай і незавершанай вышэйшай адукацыяй.

Прызнаемся, што мы таксама адгукнуліся на прапанову завочна пратэсціраваць свае веды па рускай мове. На шчасце, вынік нас не расчараваў (тым больш, што адзін з нас смела ацаніў перад выкананнем тэста сваё веданне рускай мовы на «выдатна»). Больш за тое, мы далі 8 правільных адказаў на ўсе 8 пытанняў. Аўтары Інтэрнэт-рэсурса нас павіншавалі, і паведамілі, што мы з'яўляемся «аднымі з нешматлікіх носьбітаў элітарных ведаў, даступных у наш час толькі адзінкам» (дзякуй роднай сярэдняй школе). Нашы чытачы таксама могуць сябе праэкзаменаваць (на сайце www.rb.ru), каб не рабіць паспешлівых высноў аб звышскладанасці тэстаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



# СУЧАСНЫ ДЫЗАЙН, ВЫСОКАЯ КАМФОРТНАСЦЬ, ПРЫВАБНАЯ ЦАНА, альбо ТРЫ НАГОДЫ НАБЫЦЬ АБУТАК «SIVELGA»



**ЗАТ «SIVELGA» сёння з'яўляецца адным з лідараў сярод беларускіх вытворцаў абутку клеявога метаду мацавання. Прадпрыемства пастаянна працуе над удасканаленнем якасці сваёй прадукцыі, павышае аб'ёмы вытворчасці (доля прыросту складае 9 працэнтаў у год). Толькі летась «SIVELGA» выпусціла 565 тысяч пар абутку.**

**Жаночыя, мужчынскія, дзявочыя, школьныя мадэлі — асартыментная лінейка прадпрыемства разлічана літаральна на ўсе ўзроставыя групы і сезоны. Пакупніку прапануецца багаты выбар абутку для паўсядзённага нашэння і модныя святочныя варыянты.**

— Наш абутак мае прывабны знешні выгляд і добрыя эксплуатацыйныя якасці, бо мы прымяняем толькі натуральныя матэрыялы, — тлумачыць начальнік вытворчасці Зінаіда ШАРШУКОВА. — Выключэнне могуць складаць асобныя дэкаратыўныя элементы, аднак што датычыцца скуры, мы выкарыстоўваем толькі натуральную — і для «верху», і для падкладкі. Гэта абумоўлівае высокую гігіенічную якасць нашага абутку. Асноўную долю скураных матэрыялаў мы набываем на айчынных прадпрыемствах. Пэўную частку завозім з Прыбалтыкі і Расіі. Якасць гатовай прадукцыі ў многім залежыць ад якасці камплектуючых, натуральна, мы прад'яўляем да іх самыя высокія патрабаванні. Кожная новая партыя скуры, якая паступае на прадпрыемства, праходзіць тэст-кантроль на адпаведнасць стандартам. Здараецца, што стандарты не вытрымліваюцца, і мы вымушаны вяртаць усю партыю назад.

Перад тым, як пэўная мадэль абутку паступіць у серыйную вытворчасць, узор праходзіць шэраг фізіка-механічных выпрабаванняў на адпаведнасць ДАСТу (правяраецца трываласць мацавання падэшвы і ніткавых швоў, устойлівасць задніка і паднаска, маса абутку і г.д.). І толькі пры поўнай адпаведнасці патрабаванням мадэль трапляе на паток.



Начальнік вытворчасці Зінаіда ШАРШУКОВА і кантралёр якасці скуры Наталля ШПІЛЕЎСКАЯ.

## «Карэ» і «пялёстак»

«SIVELGA» была ўтворана ў 1996 годзе, пасля рэструктурызацыі «Луча». З першых дзён свайго існавання прадпрыемства працавала ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі і, нягледзячы на ўсе цяжкасці, здолела не проста выжыць, а нарасціць аб'ёмы вытворчасці, разнастаіць асартымент, заваяваць давер пакупніка. Сёння «SIVELGA» займае трывалыя пазіцыі і на ўнутраным, і на знешнім абутковых рынках. У яе ёсць свая ніша, свае пастаянныя пакупнікі.

За гэты час прадпрыемства правяло тэхнічнае пераабсталяванне швейных патокаў. Летась былі набыты дзве спецыялізаваныя машыны для ўцягвання скуры (адна — для насочнай часткі, другая — для пятачнай).

— «Насочак» — гэта, бадай што, самы важны элемент любога абутку, — разважае Зінаіда Яфімаўна. — І ад таго, як добра будзе выканана яго нацягненне, залежыць канчатковы знешні выгляд мадэлі, яе папулярнасць у пакупніка. Натуральна, чалавек, нават спецыяліст высокага класа, не можа раўняцца з машынай у плане нацягнення скуры, таму ўкараненне ў вытворчасць памянёнага камплекта абсталявання відавочна палепшыла якасць нашай прадукцыі. Сёння мы выпускаем на гэтым абсталяванні самыя розныя жаночыя мадэлі: і з вузенькім «носікам», і з носікам «карэ», і з «пялёсткам».

## Клеявы і надзейны...

У залежнасці ад сезона і задумы дызайнера падэшва абутку прадпрыемства «SIVELGA» можа вырабляцца з поліурэтану (ПУ), тэрмаэластапласту (ТЭП) ці скурападобнай гумы (СПГ).

— Для абутку, разлічанага на асеннезімовы перыяд, не рэкамендуецца прымяняць поліурэтан, бо пры мінусавых тэмпературах ён губляе свае эластычныя якасці і пачынае «шклянець», — працягвае Зінаіда Шаршукова. — Лепшы варыянт — ТЭП. Ён захоўвае гібкасць і выдатнае счапленне з паверхняй. Увесь зімовы асартымент мы вырабляем на ТЭП-падэшве. Для веснавога і летняга абутку, разлічанага на паўсядзённае нашэнне, мы прымяняем ПУ, а ў святочных мадэлях у абцаснай частцы выкарыстоўваем СПГ. Скурападобная гума дазваляе ствараць высокі абцас з элегантным вытанчаным сілуэтам. Таму нашы мадэльныя чаравічкі, туфлікі і басаножкі стабільна карыстаюцца высокім попытам у беларускіх жанчын.

Адно з галоўных патрабаванняў да клеявога абутку — трываласць мацавання падэшвы з «верхам». Той, хто набываў так званы «расійскі Кітай», добра ведае, што клеявы абутак можа быць аднаразовым (у сэнсе — да першага дажджу, пасля якога туфлі проста развальваюцца на часткі). З абуткам «SIVELGA» такога не здарыцца, бо на прадпрыемстве прымяняюць асаблівыя тэхналогіі мацавання. Каб павысіць хімічную актыўнасць поліурэтану і глыбіню пранікнення клею, падэшву падвяргаюць галагенпіраванню (спецыяльнай хімічнай апрацоўцы). Потым праклеены абутак трапляе пад вакуумны прэс, дзе пад уздзеяннем высокіх тэмператур і завяршаецца працэс мацавання падэшвы.

— Якасць нашай прадукцыі праверана часам, — адзначае начальнік вытворчасці прадпрыемства. — Наш абутак разлічаны на масавага спажыўца. Ён мае прывабны знешні выгляд, сучасны дызайн, высокую камфортнасць, даступную цану. Усё гэта дазволіла нам заваяваць давер спажыўцоў.



**ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА:**
**ЗАТ «SIVELGA»**
*220004, г. Мінск, вул. Караля, 2*
*Тэл. (017) 226 59 90, 226 56 74*
*Факс (017) 200 10 49*
**www.sivelga.com**
УНП 101120016






Дызайнер абутку Наталля ЛЕЙКІНА.

## Увага, модніцы!

Бясспрэчным хітом вясенне-летняга сезона стаў чорны колер (а таксама яго спалучэнні з белым і шэрым). Нягледзячы на такую спартанскую каляровую манахромнасць сусветныя вытворцы абутку здолелі як след пачараваць над дызайнам і прадставілі на выбар спажыўцу вельмі багаты выбар мадэляў адкрытых туфляў і басанажак. Не засталася ў баку ад апошніх модных тэндэнцый і «SIVELGA».

— Калі гаварыць пра матэрыялы, сёлета асаблівай папулярнасцю карыстаюцца лакавыя скуры (гладкія, мятыя, з дабаўленнем перламутру, з эфектам «пад метал» — бронзу, золата, серабро), — тлумачыць дызайнер абутку прадпрыемства Наталля ЛЕЙКІНА. — У сваёй вясенне-летняй калекцыі мы актыўна выкарысталі самыя разнастайныя лакі: чорны і карычневы (гладкі, мяты, з перламутрам) — для чаравікаў; малочны, белы, шэры — для адкрытых туфлікаў; светлыя колеры і эфекты «пад метал» — для басаножак. Асобна трэба адзначыць папулярны сёлета чырвоны колер (а дакладней, усе адценні пунсовага). Хоць ён і не такі распаўсюджаны, як чорны, аднак гэтым летам таксама будзе вельмі актуальным. Сваім пакупніцам мы прапануем некалькі вытанчаных святочных, а таксама паўсядзённых мадэляў басаножак і туфлікаў з адкрытай пятачнай часткай менавіта пунсовага колеру (як у лакавым, так і ў гладкахромным выкананні).

Падоўжаныя «носікі» ўжо выходзяць з моды, — працягвае Наталля. — Сёння робіцца акцэнт на скарочаную насавую частку. Найбольш папулярныя варыянты: закруглены нос, «карэ», «пялёстак». Усе гэтыя формы знайшлі шырокае выкарыстанне ў нашай вясенне-летняй калекцыі.

Што тычыцца абцаса, вельмі высокая «шпілька» страчвае свае пазіцыі. Ёй на змену прыходзіць абутак на платформе ў спалучэнні з фігурным абцасам сярэдняй вышыні (5—7 см, аднак за кошт таўшчыні самой платформы ствараецца візуальны эфект высокай «шпількі»). Сёлета ў сваёй калекцыі мы прадставілі літаральна некалькі класічных мадэляў жаночых туфляў з абцасам «васьмёрачкай» (8 см). У пераважнай большасці нашых святочных мадэляў вышыня абцаса не перавышае 7 см. Самая папулярная яго форма — «моркаўка». Ёсць у нас і летнія мадэлі на ўстойлівай танкетцы (6—7 см) — у абутку паўсядзённага нашэння. Нашы басаножкі, выкананыя ў светлых танах (пад золата, серабро, бронзу, лакавыя і гладкахромныя), не толькі элегантныя і камфортныя, але і ўніверсальныя ў камбінаванні з рознымі стылямі адзення.

## Цудоўныя «балеткі»

Абутак «SIVELGA» вылучаецца камфортнасцю, зручнасцю калодак, нават у святочных мадэлях. Не выключэнне і калекцыя «вясна-лета 2008». Многія мадэлі маюць двайную фіксацыю, што дазваляе кожнаму пакупніку «падагнаць» абутак індывідуальна па назе. Асабліва актуальныя ў гэтым сезоне церазпад'ёмныя раменьчыкі.

Значным попытам у беларускіх жанчын карыстаюцца «балеткі» — з нізкім абцасам, карэпадобным ці закругленым носікам, на трыкатажнай падкладцы для яшчэ большай мяккасці.

— Першапачаткова мы заяўлялі іх як дзявочы асартымент, — прызнаецца Наталля, — аднак іх ацанілі не толькі дзяўчаты, але і жанчыны ўсіх узроставых катэгорый.

Прыхільніцам зручнага максімальна адкрытага абутку Наталля параіла звярнуць увагу на саба і шлёпанцы «SIVELGA» — модныя і вельмі камфортныя.

Паводле слоў дызайнера, у восеньскай калекцыі жаночага абутку па-ранейшаму будзе вельмі актуальны лак, скарочаная форма носа і невысокі абцас, буйная фурнітура.

## Абутак у стылі кэж'юэл

Доля жаночага асартыменту ў агульным аб'ёме прадукцыі прадпрыемства складае 70 працэнтаў. Аднак і мужчынскія, і дзіцячыя (школьныя) мадэльныя лінейкі даволі разнастайныя. У вытворчасці мужчынскага абутку «SIVELGA» робіць упор на класіку (і ў дачыненні да фасонаў, і да колераў), часта прымяняе двайную фіксацыю. У веснавой мужчынскай калекцыі актыўна выкарыстоўваліся лакі (хітом продажу былі лакавыя туфлі з цісненнем пад рэптылію). На спякотнае летняе надвор'е прадпрыемства падрыхтавала нашым мужчынам багаты выбар аблегчанага абутку — беспадкладачныя мадэлі светлага колеру са скразной перфарацыяй і адкрытымі элементамі.

Сярод навінак, якія, бясспрэчна, парадуюць маладое пакаленне, вызначым яшчэ паўспартыўныя мадэлі ў стылі кэж'юэл. Іх падэшва імітуе кед, аднак у адрозненне ад кеда, «верх» вырабляецца з натуральнай скуры. Такі абутак вылучаецца дэмакратычнасцю, яго можна насіць і пад джынсы, і пад штаны.

Дзіцячы, школьны і дзявочы асартымент прадпрыемства вылучаецца камфортнасцю калодак і вясёлымі, жыццярадаснымі колерамі (жоўтым, чырвоным, аранжавым), шырокім выкарыстаннем гладкіх і мятых лакаў, багатым выбарам класічных мадэляў і «балетак».

— Штогод «SIVELGA» на 80 працэнтаў абнаўляе свой асартымент. Здараецца, што нашы пастаянныя пакупнікі звяртаюцца да нас з просьбай вярнуцца да некаторых асабліва ўдалых і папулярных мадэляў, — падвяла вынікі Наталля. — Па магчымасці мы выконваем іх пажаданні, аднак мы ніколі не стаім на месцы, развіваемся далей, шукаем новыя дызайнерскія рашэнні, укараняем перадавое абсталяванне і тэхналогіі.

*Матэрыял падрыхтавалі Інга МІНДАЛЁВА і Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.*
*Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.*



Адпрацоўка новай мадэлі абутку: майстар Галіна ВАРЭНІК, мадэльер Кацярына МЯДЗВЕДЗЕВА і тэхнолаг Ганна МІКУЛІЧ.

## БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

### Байбуза



*У чырвоным полі срэбная страла джалам уніз, на ёй срэбны вуж галавою ўніз, на зялёнай мураве ўнізе тры грыбы.*

Гербам карысталіся: Амбражэвіч, Кастравіцкі.

### Вукры



*У чырвоным полі два залатыя паўмесяцы рагамі адзін да аднаго, паміж імі паўкрыжа залатога, пад імі тры брусы залатыя клінам уніз.*

Герб роду Сачкоўскіх.

**Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.**

# ЯКІМ БЫЦЬ БЕЛАРУСКАМУ МУНДЗІРУ?

Эксклюзіў

*Наша багатае гістарычнае мінулае мае шмат узораў, палітых крывёй абаронцаў роднай зямлі, якія вартыя пераймання*

**Нядаўна член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Аляксандр Самовіч паведаміў мне цікавую навіну. Падчас інаўгурацыі новага Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева тамтэйшыя журналісты чамусьці абышлі ўвагай ваеннаслужачых Прэзідэнцкага палка — аднаго з абавязковых і відовішчных элементаў усёй цырымоніі. На сайтах з'явіўся, актыўна абмяркоўваўся (быў выказаны асаблівы рэспект Беларусі за цікаўнасць да тэмы) матэрыял са «Звязды» за 2004 год. Справа ў тым, што гэта менавіта наш зямляк Аляксандр Самовіч некалі настаяў на адраджэнні традыцыйнай рускай формы, якая адносіцца да перыяду 1812 года, для салдат і афіцэраў расійскага Прэзідэнцкага палка, пра што мы калісьці і расказалі. Напярэдадні 60-годдзя вызвалення Беларусі прымаў Аляксандр Леанідавіч удзел і ў распрацоўцы асобай парадной формы зводнай роты Ганаровай варты, пра што мы таксама пісалі.**



**Так, працяглы час я цікаўлюся ваеннай гісторыяй, у прыватнасці, геральдыкай і ўніформай. З дапамогай розных спецыялістаў падрыхтаваў (і, спадзяюся, зраблю яшчэ) шэраг матэрыялаў на гэтую тэму. І вось нядаўняя сустрэча з Аляксандрам Самовічам абудзіла пытанне, якое ўзнікла даўно, але па шэрагу прычын адкладвалася на «потым». Усе мы ў захапленні ад формы зводнай роты Ганаровай варты і асабліва — ад яе плацпарадаў. Але форма гэта — сучасная, яна адлюстроўвае гісторыю толькі апошніх дзесяцігоддзяў. Зрэдку падчас святкаванняў яшчэ можна пабачыць стылізацыю пад 1945 год: салдат у касках, плашч-палатках і з нязменным ППШ у руках, яшчэ радзей — у будзёнаўках на тачанцы з кулямётам «Максім». Але і гэта гісторыя ўсяго толькі аднаго — савецкага — перыяду. Памянёная ўніформа расійскага Прэзідэнцкага палка адносіцца да часу (таксама ўсяго толькі аднаго) 1812 года, тым не менш мы бачым хоць бы такое паглыбленне ў гісторыю, зварот да каранёў. Нашай зямлі — не адно стагоддзе, яе межы заўсёды абараняліся арміяй, якая, зразумела, мела сваю адметную ўніформу. На свае вочы мне даводзілася бачыць Ганаровую варту адпаведна каля каралеўскага і прэзідэнцкага палацаў у Лондане і Празе (глядзі фота), там гэта повязь часоў — менавіта праз мундзіры гвардзейцаў — яскрава прасочваецца. Дык што было ў нас раней? Якой была ваенная форма нашых продкаў? Гэтыя пытанні мы адрасавалі даўняму сябру «Звязды», які ўжо дзесяць гадоў займаецца графічнай рэканструкцыяй даспехаў і ўніформы Белай Русі — <u>члену Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Віктару ЛЯХАРУ.</u> Пачаўшы размову з цырыманіяльнай формы, у выніку мы выйшлі да няпростага пытання: якім быць увогуле мундзіру беларускага вайскоўца. Але аб усім па парадку.**

## Першыя крокі да адзінства

Гаварыць аб нейкім адзіным стылі адзення беларускіх воінаў да XVI стагоддзя не даводзіцца, хоць прызнакі спробаў укаранення такога адзінства існавалі яшчэ з часоў рыцарства. Выступаючы ў паход, рыцар (а пазней князь — дружыну) імкнуўся апрануць слуг і збраяносцаў у вопратку колеру свайго герба і сцяга. Апалчэнне гарадоў і мястэчак Беларусі, экіпіраванае за кошт гарадской казны, таксама магло мець канкрэтную тэрытарыяльную сімволіку.

З цягам часу баявая практыка і пытанні дысцыпліны ўсё больш патрабавалі ад военачальнікаў адзінства: спалучэння колеру салдацкага адзення са сцягам палка. У 1595 годзе ў Вялікім княстве Літоўскім з каралеўскіх сялян пачалі фарміраваць пяхотныя роты «выбранцаў», узброеных і экіпіраваных па венгерскім узоры. Выбранцы першыя сярод пяхоты атрымалі мундзір устаноўленага ўзору — «барву» адзінага пакрою і колеру для кожнай роты *(малюнак 1)*. Згодна з гістарычным дакументам таго часу, колер мундзіраў быў, як правіла, шэра-блакітнага колеру. Аднак уніформу, прадугледжаную сеймавай канстытуцыяй, з-за недахопу грошай мелі далёка не ўсе. Ротмістры, якія атрымалі права ад караля набіраць сялян у войска, маглі дазволіць сабе касцюм у адпаведнасці з модай і традыцыямі. У адзенні назіралася вялікая разнастайнасць. Агульныя для ўсёй пяхоты кафтаны («польскія», «рускія», «венгерскія») адрозніваліся толькі даўжынёй. Акрамя ботаў насілі башмакі — са скуранымі гетрамі ці панчохамі. Адданасць каралю ці князю выказвалася праз герб ці вензель на сцягу і на ўніформе. Ваенныя мундзіры адрозніваліся ад цывільных нязначна, бо тады больш думалі не пра поле бою, а больш пра статус салдата, які знаходзіўся на службе ў манарха.



*Малюнак 1.*

## Першыя драгуны

У пачатку XVII стагоддзя на тэрыторыі Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага каралём Жыгімонтам III былі сфарміраваны першыя драгунскія палкі. Па сваёй арганізацыі драгуны былі падобныя на пяхоту і выкарыстоўвалі коней толькі для мабільнага перамяшчэння *(малюнак 2)*. Ахоўнага ўзбраення яны не мелі. Адзенне ў большасці палкоў адпавядала агульнаеўрапейскаму касцюму пяхоты: розныя па крою і расфарбоўцы кафтаны, камзолы, боты, батфорты, шапкі, атарочаныя футрам. У прыватных арміях Сапегаў, Радзівілаў драгуны не адрозніваліся ні ўзбраеннем, ні абмундзіраваннем.



*Малюнак 2.*

## Гвардзейцы-прыгажуны

У 1717 годзе ствараюцца першыя палкі Гвардыі Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку і Лейбрэгімент драгунаў каралеўскіх ВКЛ. Ідучы па прыкладзе Саксоніі, гвардыю апранулі ў мундзіры чырвонага колеру, са светла-сінім каўнерам, манжэтам і лацканамі *(малюнак 3)*. Адлюстраваны на малюнку афіцэр *(малюнак 4)* апрануты ў гвардзейскі мундзір узору 1792 года без лацканаў з эпалетамі. Мундзір падпаясаны афіцэрскім шалікам, які затканы па серабру цёмна-чырвонай ніткай. На нагах — белыя скураныя ласіны і высокія батфорты. На руках — белыя замшавыя пальчаткі-крагі з раструбамі. І афіцэрам, і салдатам належала насіць напудраныя парыкі. Галаўныя ўборы — двухкутныя шляпы-бікорны, абшытыя жоўтым галуном з белай мацерчатай кукардай і плюмажом. Да мундзіра ўзору 1792 года належала насіць белы шыйны платок.



*Малюнак 3.*



*Малюнак 4.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
***(Заканчэнне ў наступным нумары.)***

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.37 | 16.57 |
| Віцебск — | 4.22 | 21.34 | 17.12 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.27 | 16.57 |
| Гомель — | 4.36 | 21.14 | 16.38 |
| Гродна — | 4.57 | 21.50 | 16.53 |
| Брэст — | 5.07 | 21.42 | 16.35 |

**Месяц**

*Маладзік.*
*Месяц у сузор'і Блізнятаў.*

**Імяніны**

**Пр.** *Івана, Калініка, Мікіты, Сцяпана, Сямёна, Фёдара.*
**К.** *Марыі, Паўліны, Лаўрэнцыя, Нікіфара, Норберта, Сымона.*




# Чытайце ў наступным нумары

## Пенагазасілікатныя страсці

**Дырэктар магазіна паказаў мне ў рэкламнай газеце аб'яву аб продажы нейкім прадпрымальнікам каменя сілікатнага, блокаў ПГС і цэглы чырвонай. Звонім яму па мабільніку і пытаем, ці можам купіць у яго тры паддоны блокаў з дастаўкай у названую намі прыгарадную вёску. А чаму ж не, адказвае ён і называе цану — 700 тысяч за паддон, а ўсяго з аплатай за транспарт — 2140 тысяч рублёў. Пачынаем падлічваць і атрымліваецца, што на тых трох паддонах, якія змяшчаюць 8,52 кубаметра блокаў, той перакупшчык, які набывае ў магазіне прадпрыемства тавар па дзяржаўных цэнах, наварвае 688 590 рублёў. А калі гэта дзесяць паддонаў (28,4 кубаметра блокаў), дык на халяву дастаецца 2 256 350 рублёў, калі ж 35 (99,4 кубаметра), дык лічба падскоквае да 7 897 050 рублёў. Ёсць перакупшчыку за што старацца, ёсць!**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.856 Індэкс 63850. Зак. № 2986. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12